22 верасня – Усясветны дзень без аўтамабіля.

№ 72 (4632)

21 верасня 2021 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.



Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...*
Якуб КОЛАС

ЛІСТ З РЭДАКЦЫІ

Падпішыцеся, калі ласка, на PDF-версію «Народнай Волі»!

Час ідзе, а праблема з доступам газеты «Народная Воля» (як, дарэчы, і іншых незалежных выданняў) да друкарань не вырашаецца. Таму даносім свабоднае СЛОВА ў электронным варыянце. А паколькі рэдакцыя не мае даходаў ад рэалізацыі газеты ў шапіках, выключаны іншыя формы папаўнення бюджэту, то вялікая зацікаўленасць у тым, каб было як мага больш падпісчыкаў на PDF-версію газеты. У выйгрышы ад гэтага не толькі рэдакцыя, але і вы, шаноўныя чытачы. З цікавымі, змястоўнымі матэрыяламі кожнага чарговага нумара «Народнай Волі» вы маеце магчымасць азнаёміцца значна раней, чым яны з'явяцца на сайце. Па-другое, калі мы адновім выданне газеты ў нармальным рэжыме, то для вас, сённяшніх падпісчыкаў PDF-версіі, будуць спецыяльныя бонусы.

Падпісацца на PDF-версію «Народнай Волі» можна на сайце ***belpressa.by***. Для гэтага трэба зайсці на сайт ***belpressa.by***, націснуць ўкладку ***«2021»*** і выбраць месяцы, на якія вы будзете афармляць падпіску.

Асобна звяртаемся да тых, хто мае магчымасць праявіць адрасную дабрачыннасць. Ёсць некалькі спосабаў пералічыць грашовыя сродкі (даём рэквізіты ў рускамоўным варыянце) на рэдакцыйны рахунак.

1.Через ЕРИП:
СМИ – Н (просто буква) – «Народная Воля» – Добровольные взносы.
2.Через БАНК:
ИЧУП «Народная Воля». 220030 г.Минск, ул.Энгельса, 34а
р/с BY08 PJCB 3012 0065 3510 0000 0933,
Код PJCBBY2X, ЦБУ 113 «Приорбанк» ОАО, г.Минск
УНП 100961759, ОКПО 37381505
Загадзя выказваем шчырую ўдзячнасць!

Вы — з «Народнай Воляй», «Народная Воля» — з Вамі!

БЛИЦ

На недавней встрече с В.Путиным А.Лукашенко заявил, что не исключается возможность возвращения к вопросу о единой валюте Беларуси и России. Вот цитата:

«Что касается единой валюты, я хочу, чтобы вы, как журналисты, понимали: вопрос не в том, что Путин или Лукашенко тормозят эти процессы. Когда мы изучали эту проблему, тогда Центральный банк России и наш Национальный банк в один голос попросили к этому вопросу пока не подходить. Они заявили, что ни они, ни наши страны не готовы к этому. Мы с президентом (Владимиром Путиным), услышав это, отложили эту проблему в сторону. Но это не значит, что мы к ней не вернемся», – сказал А.Лукашенко.

Можно ли оставить эти слова без внимания? Конечно, нет. Деньги – это не просто политика, а, считай, то, что определяет судьбу страны, всех ее жителей.

Поэтому «Народная Воля» решила узнать общественное мнение, сформулировав вопрос в такой редакции:

Нужна ли Беларуси общая валюта с Россией?

Станислав БОГДАНКЕВИЧ, доктор экономических наук, экс-глава Нацбанка Беларуси:

– Если считать, что мы уже де-факто утратили суверенитет и создаем единую экономику при формальном наличии двух государств, то общая валюта была бы полезна. Мы фактически влились бы в экономический состав России. Россия нам дает до 10 миллиардов в год дотаций, поддерживает нас, предоставляет льготные цены на энергоносители, кредиты, – какие мы суверенные при таком подходе?

Минус вот в чем: из-за того, что Россия нас содержит, мы не имеем достойной производительности, нет реальной конкуренции, нет борьбы за снижение издержек, внедрения новейших технологий. Это глубинная причина, которая ведет к застою…

Если бы Россия была цивилизованная и либеральная, то иметь с ней тесные отношения было бы очень хорошо. Это и ресурсы, и рынок сбыта. Но ведь мы знаем, что сегодня представляет собой Россия…

При единой валюте не может быть равенства между маленьким государством и огромной Россией.

Своя собственная валюта – это признак сохранения суверенитета. Белорусский рубль нужен, если мы хотим сохранить суверенитет. Общая валюта может быть при формальном соблюдении суверенитета – я имею в виду собственную Конституцию, собственный парламент, судебную власть. Чисто теоретически такое, мне кажется, возможно. В конце концов, есть пример Европейского Союза с единой валютой, но при этом все страны сохраняют суверенитет. Но и там есть минусы – мы это наблюдаем на примерах Италии, Греции.

С другой стороны, если есть общая валюта, значит, должен быть общий парламент, который утверждал бы единый бюджет…

Геннадий ЛЫЧ, академик Национальной академии наук, доктор экономических наук:

– Думаю, Александр Лукашенко согласен на всё, лишь бы Владимир Путин его поддерживал. Но единая валюта – это потеря экономического суверенитета. Больше мне добавить нечего.

Василий ШЛЫНДИКОВ, экономист, экс-глава концерна «Амкодор»:

– Даром не нужна!

Если будет общая валюта, значит, придет конец Беларуси как самостоятельному государству. Это полная сдача независимости, предпоследний шаг к аннексии Беларуси. Других вариантов быть не может.

И менять шило на мыло… Ведь экономика России уже давно не развивается. Я лично за то, чтобы Путин победил на следующих выборах и тем самым помог развалиться этому агрессивному государству, которое не дает спокойно жить ни своим соседям, ни мировому сообществу. Такое вполне может быть.

По сути, под общей валютой, скорее всего, предполагается российский рубль. Вряд ли россияне согласятся назвать общую валюту, например, талером. И печатать деньги будет Россия, а если второй печатный станок будет у нас – мы, конечно, напечатаем, тут вопросов нет (*смеется*), но на это никто не согласится.

Если бы в качестве общей валюты предлагалось, например, евро, то можно было бы и перейти. Но только не российский рубль!

Николай СТРЕЛЬЦОВ, почетный председатель РОО «Белорусская научно-промышленная ассоциация»:

– Это вопрос времени. Если обратить внимание на тот же Евросоюз – они же пришли к единой валюте. Думаю, аналогичные процессы ждут и Беларусь с Россией.

Как быть с суверенитетом – тут есть, конечно, вопрос… Но пока, как я понял, президенты двух стран договорились не спешить с решением этих вопросов, нужно, чтобы экономика созрела. Но, думаю, это неизбежный процесс.

Виталий ВАСЮКОВ, заместитель председателя постоянной комиссии по бюджету и финансам Палаты представителей, в прошлом – директор филиала №215 ОАО «АСБ Беларусбанк» в г.Орше:

– Я по телефону ничего комментировать не буду, я не вижу ваших глаз. И вообще, извините, не буду давать вам комментарии, я контактирую с официальными СМИ.

Дмитрий КУЧУК, председатель Белорусской партии «Зеленые»:

– На мой взгляд, не нужна общая валюта с Россией. Своя валюта – это независимость. А единые деньги ее значительно ослабят. И не факт, что белорусы выиграют от общей валюты. Лучше заниматься своим рублем, укреплять его.

Андрей САВИНЫХ, председатель Постоянной комиссии по международным делам, член Совета Палаты представителей:

– И России, и Беларуси прежде всего нужна валюта, которая не будет деривативом от доллара США. Вот это, на мой взгляд, задача номер один и важнейший фактор нашего устойчивого развития в ближайшие десятилетия, особенно на фоне крушения глобальной финансовой системы.

Борис ЖЕЛИБА, доктор экономических наук, профессор:

– Общей валюты с Россией у нас никогда не будет. Перейти на российский рубль – это положить конец белорусскому суверенитету, экономическому и политическому. Если будет российский рубль, то и бюджет будет утверждаться в Москве. Поэтому я полагаю, что мы, несмотря ни на какие заявления, останемся с белорусским рублем.

Виктор МАРГЕЛОВ, бизнесмен, сопредседатель Республиканской конфедерации предпринимательства:

– Общая валюта – всего лишь инструмент. Если этим инструментом грамотно пользоваться, это может дать хороший результат. Но пока Беларусь и Россия не решили другие, более простые вопросы, и поэтому, на мой взгляд, преждевременно задействовать этот инструмент.

Но плюсы в общей валюте, безусловно, есть. Основной вопрос – эмиссия, кто будет печатать деньги. И если вводить единую валюту, то надо делать это на максимально выгодных для всех условиях.

Жанна ТАРАСЕВИЧ, директор Бизнес-союза предпринимателей и нанимателей имени профессора Кунявского, преподаватель Белорусского государственного экономического университета:

– А какая валюта? Если это не рубль белорусский и не рубль российский, то какая? И где будет эмиссионный центр, какие будут правила игры?

Если посмотреть на Европейский Союз, то он достаточно долго шел к единой валюте, и там у многих государств определенные правила игры. Например, у Польши осталась своя собственная валюта, но при этом страна входит в Евросоюз.

Мне кажется, этот вопрос еще недостаточно хорошо проработан. Если будет общая валюта, то важно, чтобы это был и не российский, и не белорусский рубль. Ну и должны быть очень четко прописаны правила игры.

Опрашивала Марина КОКТЫШ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Што з бацькамі Паўла Севярынца?



*Яшчэ тыдзень таму стала вядома, што бацькі палітвязня **Паўла Севярынца** захварэлі на каранавірус. Як яны сябе адчуваюць зараз?*

«Тата патрапіў у інфекцыённую бальніцу Віцебска з кавідам, падключылі кісларод, – паведамляла раней сястра Паўла **Ганна Севярынец** на сваёй старонцы ў «Фэйсбуку». – *Мама пакуль дома, але таксама моцна захварэла…».*

Так, **Канстанцін Севярынец** да гэтага часу знаходзіцца ў бальніцы, хаця, паводле слоў яго жонкі Таццяны, *«Палыч ужо сала захацеў, значыць, выкараскаемся».*

– Шчыра кажучы, я нават і не ведаю, які ў мяне сёння рэальны стан здароўя, – кажа **Таццяна Севярынец**. – Тэмпературы няма, апетыт як быццам крыху вярнуўся, смак не губляла. Кашаль застаецца, але да доктара дагрукацца не магу, мне нават не прызначалі здаць аналізы.

Адным словам, у тых умовах, у якіх я знаходжуся (на самаізаляцыі), немагчыма нават зрабіць тэст на каранавірус. Такім чынам, я дома, а Кастусь па-ранейшаму ў бальніцы.

– Ці палепшыўся стан яго здароўя?

– Лечыцца, але ў мужа ёсць сардэчныя хваробы, таму гэта дадае складанасцяў. Калі яго забіралі, практычна не мог дыхаць, хаця сатурацыя была ў норме. Кастусь ужо тыдзень знаходзіцца на кіслародзе. Ён вельмі нервуецца, але да ўрачоў прэтэнзій няма.

У гэтую нядзелю вечарам яму стала лепш, нават сала папрасіў, зранку зноў стан пагоршыўся. Калі хварэеш на каранавірус, то амаль тры тыдні знаходзішся, як на арэлях: то лепш, то горш. Спадзяюся, выкараскаемся.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ЗА КРАТАМІ

Вольга ІВАШЫНА: «Мужу вяртаюць лісты…»

Жонка гродзенскага журналіста-фрылансера распавяла, што сувязь з Дзянісам практычна адсутнічае.

Нагадаем, што **Дзяніса Івашына** затрымалі 12 сакавіка паводле арт.365 Крымінальнага кодэкса – *«Умяшанне ў дзейнасць супрацоўніка ўнутраных спраў».*

Днямі стала вядома, што яму выстаўлены яшчэ два новыя абвінавачанні: у здзяйсненні менш цяжкага і асабліва цяжкага злачынстваў. Праўда, не ўдакладняецца, што гэта за абвінавачанні.

– *З ліставаннем сітуацыя крыху палепшылася, прынамсі да Дзяніса мае і ад мамы лісты сталі даходзіць,* – кажа **Вольга Івашына**, жонка журналіста. – *А вось з ізалятара стандартна – раз у месяц. Акрамя таго, стала вядома, што мужу вяртаюцца шматлікія лісты, якія ён адпраўляе на волю.*

Блакада лістоў – гэта, відаць, такая стандартная працэдура, каб прымусіць зняволенага да супрацоўніцтва са следствам. Магчыма, каб блізкія паўплывалі на чалавека, давялі, што варта ўзяць віну на сябе. Але я ведаю Дзяніса – ён на здзелку з сумленнем ніколі не пойдзе.

Паводле слоў Вольгі Івашынай, муж сумуе і піша, што бавіць час як толькі можа, бо ў ізалятары няма чым заняцца.

– *Перадачы прымаюць, тут ніякіх праблем няма,* – дадае Вольга. – *Практычна ўсё перадаём, што дазваляецца. Лекі яму перадавалі, бо, як вядома, мы даведаліся, што ў Дзяніса ёсць праблемы з сэрцам. Ставіцца папярэдні дыягназ «ішэмічная хвароба», але патрэбна абследаванне, якое, думаю, у ізалятары не зробяць.*

Сяргей ЗАБЛОЦКІ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
21 ВЕРАСНЯ 2021 г.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Валерый КОСТКА:

«Сказалі, што пенсія зменшыцца прыблізна на 150 рублёў…»

*Што змянілася ў жыцці падпалкоўніка ў адстаўцы **Валерыя Косткі** пасля таго, як яго спецыяльным прэзідэнцкім указам пазбавілі воінскага звання? Якую пенсію ён цяпер атрымлівае? І як адрэагаваў суд на скаргу Косткі з нагоды пазбаўлення звання? Пра гэта і не толькі ён распавёў «Народнай Волі».*

– Ну як змянілася маё жыццё? Ніяк: як працаваў, так і працую на ніве сельскай гаспадаркі, – *адказвае Валерый Костка на пытанне «Народнай Волі».* – Паводле маіх дадзеных, ад пачатку, як з'явіўся гэты ўказ, і да пачатку верасня пенсія практычна ні ў кога не змянілася.

Я 29 гадоў як на пенсіі, у адстаўцы даўно, а мяне звання пазбаўляюць. Ну што гэта зменіць? Я ж не хаджу, зоркі не прыкручваю на сваё цяперашняе рабочае адзенне. Таму гэты ўказ абсалютна нічога не мяняе з пункту гледжання майго жыцця. Я разумею, што, калі прыйдзе нармальная ўлада і ў краіне будуць дзейнічаць законы і захоўвацца правы чалавека, усё стане на свае месцы.

Можа, нехта і хацеў бы, каб я пачаў нервавацца з-за ўсяго гэтага, але я на гэта проста не звяртаю ўвагі. Працую. А час ідзе ў бок светлых сіл, ніколі зло не здолее перамагчы дабро. Таму я спакойны, як удаў.

– У маі як падпалкоўнік у адстаўцы вы атрымлівалі 800 рублёў пенсіі. А зараз?

– Літаральна днямі патэлефанавалі і паведамілі, што пенсію скароцяць. Будуць вылічваць цяпер і тыя грошы, якія чатыры месяцы са дня падпісання гэтага ўказа налічвалі, – агулам каля 500 рублёў недзе. Сказалі, што прыблізна рублёў на 150 зменшыцца пенсія – цалкам прыбяруць надбаўку, якая тычыцца звання.



Я звярнуўся ў суд Ленінскага раёна, бо не згодны з рашэннем аб пазбаўленні мяне звання. Разумею, што ніхто не будзе гэтыя скаргі разглядаць, але гэта яшчэ адзін доказ таго, што ў нас дыктатура, што не існуе незалежных судоў і пракуратуры, якая павінна сачыць за выкананнем законаў. У нас створана класічная дыктатарская сістэма ўлады. І няхай часова ўказы падмянілі законы, але ж законы ніхто не адмяняў, і, калі зменіцца сітуацыя, закон усё роўна запатрабуе адказнасці ад тых, хто яго парушыў. Паміж злачынствам і пакараннем заўсёды існуе сувязь, яна можа расцягвацца па часе, але гэта няважна. Усе адкажуць за парушэнне правоў.

Што гэта за дзяржава, якая не можа выканаць права на жыццё, не кажучы ўжо пра права на мірны пратэст, права на атрыманне інфармацыі, права выбіраць і быць абраным, права на незалежныя сродкі масавай інфармацыі, на абарону ў судзе?! Трэба ўсвядоміць, што мы жывём пры дыктатуры і таму апеляваць зараз да Лукашэнкі, патрабаваць ад яго нейкіх дэмакратычных крокаў – гэта абсурд. Такі ж самы абсурд, як і прапаноўваць альтэрнатыўную Канстытуцыю на рэферэндум. Пры дыктатуры няма рэферэндумаў. Гэта гульня ў Канстытуцыю – проста затрымка часу, каб дзень прастаяць ды ноч пратрымацца, больш нічога я тут не бачу.

Мае палітычныя погляды не змяніліся. Я не ўцягнуты ні ў якія палітычныя разборкі, і збоку магу назіраць усе працэсы больш-менш аб'ектыўна. І я добра разумею, што галоўнае пытанне ў цяперашняй сітуацыі – гэта зусім не Лукашэнка, памяняць яго ці не. Галоўнае – гэта сама сістэма палітычнай улады. Зменіцца сістэма – усё стане на свае месцы, і будуць выбіраць лепшых з лепшых.

Я аптымістычна гляджу ў будучыню. Усё ідзе нармальна, разумею, што працэс гніення – ён не адбываецца за суткі ці двое. У нас некаторыя кажуць: «Рэвалюцыя правалілася». На мой погляд, ніякай рэвалюцыі і не было. Была дэманстрацыя нязгоды і пратэстнага настрою. Безумоўна, у гэтых умовах, калі ўлада не можа нічога прапанаваць, а людзі не хочуць жыць, як прапануе ўлада, наперадзе можа быць нейкая крызісная сітуацыя. І чым мацней зараз гайкі закручваюцца, тым мацней магчымы выбух. Мяне турбуе, што няма жадання ў палітыкаў шукаць мірны выхад з гэтага становішча, ёсць толькі задача на жорсткае ўтрыманне ўлады, а гэта вядзе да супраціву. Усё больш я баюся таго, што жорсткія меры супраць свайго народа народзяць нейкія экстрэмісцкія формы супрацьстаяння. У такім выпадку пераход ад адной сістэмы да другой можа быць і не без крыві. І не народ тут вінаваты. Народ спрабуе вярнуць свае канстытуцыйныя правы. Нас паддурвалі, падманвалі, заманьвалі светлай будучыняй, абяцаючы і па 500, і па 1000 долараў заробку. Людзі верылі. А калі вера закончылася, перспектыў у дыктатуры няма. І тут ніхто не дапаможа, нават Пуцін. Свой лёс беларускі народ будзе вырашаць сам.

– Паводле вашых падлікаў, калі адбудуцца наступныя прэзідэнцкія выбары? У 2025 годзе альбо раней?

– Я аптыміст і веру, што ўсё будзе нашмат хутчэй. Мяркую, выбары могуць адбыцца летам–восенню наступнага года.

Першае і самае важнае, што трэба зрабіць, – вярнуць народу права выбіраць і кантраляваць уладу.

Людзі бягуць з краіны. Я маю зносіны з прадстаўнікамі малога і сярэдняга бізнесу: у многіх думкі толькі пра тое, каб захаваць капітал, некуды яго перавесці і не трапіць за краты. Людзі баяцца нешта рабіць у Беларусі. А калі яны бягуць, то хто будзе плаціць падаткі? Не самыя ж горшыя з'язджаюць! Думаю, у атачэнні Лукашэнкі таксама разумеюць трагічнасць сітуацыі. І прычына тут адна: у нас няма прыярытэту права.

– Які адказ на сваю скаргу вы атрымалі ў судзе?

– У судзе Ленінскага раёна сказалі, што ў маёй скарзе ўтрымліваюцца некарэктныя фразы і выразы. Але я не разумею, што там можа быць некарэктнага? Я звярнуўся да іх з просьбай прызнаць Лукашэнку нелегітымным кіраўніком дзяржавы, а ягоны ўказ – нікчэмным. Між іншым, пры гэтым яны не напісалі, што Лукашэнка – легітымны прэзідэнт.

У судоў увогуле дзіўная пазіцыя.

У жніўні 2020 года Вярхоўны суд адмовіўся разглядаць скаргі на дзейнасць Цэнтрвыбаркама. Тым самым Вярхоўны суд, якому перадалі права вызначыць, хто перамог і ці адбыліся выбары, проста ўхіліўся ад прыняцця такога рашэння.

На мой погляд, нелегітымнасць Лукашэнкі не ў тым, што былі фальсіфікацыі. А ў тым, што выбары не адбыліся. Рашэнне Цэнтрвыбаркама спрабавалі абскардзіць тры кандыдаты ў прэзідэнты. І сам Лукашэнка спачатку называў адну лічбу, з якой ён нібыта перамог, а затым іншую. Атрымліваецца, што нават ён не ведае, колькі дакладна людзей за яго прагаласавала. Права прызначыць прэзідэнта перайшло да Вярхоўнага суда. А Вярхоўны суд у той самы час, калі дзясяткі тысяч чалавек былі на вуліцах, труханўў і заявіў: маўляў, мы не будзем разглядаць гэтую справу. І такім чынам Вярхоўны суд не паставіў кропку ў гэтых выбарах. І таму можна лічыць, што выбары не адбыліся.

Зразумела, што Ленінскі суд мне адмовіў. Я звярнуўся ў Мінскі гарадскі суд і папрасіў, каб мне растлумачылі, што такога некарэктнага ў маёй скарзе. Мінскі гарадскі суд адказаў: маўляў, судовая сістэма ў нас незалежная і мы не можам аказваць ціск на суддзю, таму мы пацвярджаем, што скарга некарэктная, і адмаўляем вам. Я пайшоў у Вярхоўны суд, бо лічу, што ў дадзеным выпадку сур'ёзна парушаны мае правы. Ніхто мяне не судзіў, ніхто мяне не прызнаваў ні ў чым крымінальным. Толькі ў 1998 годзе мяне судзілі за арганізацыю антыфашысцкага маршу, я атрымаў штраф. Але гэта было даўным-даўно. Іншых крымінальных прысудаў у мяне не было, таму не было абсалютна ніякіх падстаў ні для суда, ні для Лукашэнкі пазбаўляць мяне звання. Мяне суд павінен прызнаць у нечым вінаватым і толькі пасля пазбавіць звання. Я маю права на свабоду выказванняў. Але за меркаванне звання не пазбаўляюць. Таму, на маю думку, гэты ўказ – такая дзіўная спроба пацягаць за валасы.

– Ведаю, што вас многія падтрымлівалі…

– Мне з гэтай нагоды столькі людзей пазванілі! Мяне ніколі не віншавалі столькі, нават калі прысвойвалі воінскае званне! Адкуль толькі не тэлефанавалі – і сябры, і з-за мяжы, я ж шмат з кім кантактаваў і ў контрразведцы, і ў Ваеннай акадэміі, сябры па ўсім свеце раскіданы. Памятаю, прачнуўся ў той дзень, а жонка кажа: «Цябе звання пазбавілі…» Я за 28 гадоў ужо забыў, дзе тыя пагоны носяцца…

– Жонка перажывала?

– Ды не. Воінскае званне мае значэнне, калі ты знаходзішся на службе. А так… Да мяне зараз прыязджаюць і генералы, і палкоўнікі, у тым ліку і тыя, хто займае адказныя і вельмі высокія пасады ў Расіі. Мы як сябры гарэлку п'ём – званне цяпер не мае ніякага значэння. Толькі чалавечыя стасункі. Я ні з кім адносін не сапсаваў. Магчыма, не заўсёды супадаюць нашы погляды на жыццё, напрыклад, з тымі ж расіянамі. Імперскасць – гэта ў іх у крыві, але чыста чалавечыя адносіны ў нас добрыя.

Як бы там ні было, Марына, я веру, што наперадзе ў нас будуць змены. Гэта непазбежна. Таму верам, можам, пераможам!

Марына КОКТЫШ.

У ТЭМУ

Сяргей АНІСЬКА:

«Збіраюся з кепкай і гітарай ісці спяваць на прыступках КДБ»

*Падпалкоўнік КДБ у адстаўцы **Сяргей Аніська** збіраецца ісці ў суд з-за таго, што з кастрычніка ягоная пенсія істотна зменшыцца. Пра гэта ён распавёў «Народнай Волі».*



– Маё жыццё змянілася толькі 20 верасня, – *гаворыць Сяргей Аніська.* – Чатыры месяцы ў мяне з пенсіі нічога не ўтрымлівалі. Мы нават адчувалі сябе крыху няўтульна, бо што гэта такое: прэзідэнт аб'явіў, ва ўказе нашы прозвішчы ёсць, а грошы не забіраюць! Кожны з тых, чыё прозвішча фігуравала ў гэтым указе, маглі сказаць: ну падлы камітэтчыкі, засланыя казачкі!

Першым, у каго пачалі ўтрымліваць грошы з пенсіі, стаў былы начальнік ДАІ Мінска. Таксама адразу пачалі вылічваць у тых, хто звольніўся на знак пратэсту пасля падзей мінулага года. А мы з Валерыем Косткам звольніліся даўным-даўно, мы на пенсіі, як кажуць, ужо болей гадоў, чым жанаты!

І вось 20 верасня раптам у мяне раздаецца званок з пенсіённага аддзела КДБ. Кажуць: маўляў, за чатыры месяцы мы з вас павінны ўтрымаць больш за 500 рублёў, вы нам вінныя. І гэтая жанчына мяне супакойвае: вы не хвалюйцеся, ваша пенсія будзе складаць 1091 беларускі рубель з 1 кастрычніка.

Пенсіі ў нас прыстойныя – тут утойваць няма чаго, тым больш што ў мяне яшчэ «афганскія» налічэнні. Нехта скажа: маўляў, дык пенсія і так нядрэнная. Але мая жонка гаворыць, што раней было лепей. І чаму я павінен губляць грошы, на якія маю законнае права?

Мы з Косткам параіліся і вырашылі, што калі з нас адразу паспрабуюць вылічыць гэтыя грошы, то па рэкамендацыі юрыста Гары Паганяйлы будзем падаваць у суд на гэтыя пенсіённыя аддзелы.

Я кажу Костку: Валера, ну а што нам ужо губляць, пойдзем да канторы, возьмем гітару, побач пакладзём кепку і будзем зашыбаць грошы. Будзем спяваць на прыступках КДБ. Ну а што рабіць? Таму, калі ёсць нехта, хто танна прадае гітару, – скажыце, буду ўдзячны (*усміхаецца*).

Я ад спадара Лукашэнкі не атрымаў ніводнага звання. Усе свае званні да майора я атрымаў у Савецкім Саюзе, падпалкоўніка мне прысвоіў былы старшыня КДБ Уладзімір Мацкевіч. Пенсіянерам я стаў тады, калі Лукашэнка толькі прыйшоў да ўлады. На ўсіх маіх пасведчаннях аб медалях таксама няма подпісу Лукашэнкі. Тады пытанне: якое ён мае права пазбаўляць мяне звання?

Ясная справа, што не памром мы без гэтых грошай. Мазгі ёсць, рукі адтуль, адкуль трэба, растуць. Але ж гэта справа прынцыпу!

О ТОМ, ЧТО ВОЛНУЕТ…

Дмитрий ПИНЕВИЧ,
министр здравоохранения:

«Чрезвычайной ситуации нет»

*В соцсетях пишут, что якобы в столичных больницах не хватает мест, коронавирусом болеют как привитые, так и непривитые. Как на самом деле обстоят дела в больницах? Если верить министру здравоохранения **Дмитрию Пиневичу**, то в этом плане нет повода для волнения*

«Из 100 тысяч коек, которые есть в стране, перепрофилирована под ковид почти треть, – *сказал он вчера.* – Основная часть из перепрофилированных еще пустует.

Четвертую волну мы уже анонсировали – согласно прогнозам, она должна была прийти. К сожалению, холодная погода способствует росту заболеваемости. Сейчас мы находимся почти на самых высоких цифрах минувших волн. Сложность в том, что эти цифры повторяются изо дня в день, в том числе по госпитализации. Чрезвычайной ситуации нет, но требуется напряжение сил системы здравоохранения».

Пиневич убеждает белорусов вакцинироваться.

«Мне не хотелось бы приглашать белорусов на экскурсию в реанимационные отделения больниц, – *говорит министр.* – Мировой опыт говорит, что вакцинация – это единственный способ сохранить свое здоровье и жизни своих близких».

По его словам, в Беларуси «есть российско-белорусский «Спутник», китайская вакцина, еще однокомпонентный «Спутник Лайт» поступает в регионы». «Ведутся переговоры по Pfizer. При этом есть публикации, которые говорят, что векторная вакцина имеет более длительный эффект. Я попросил туроператоров провести соцопрос, сколько человек хотят им привиться, отсюда и будем делать выводы. Для нас важны качество, безопасность и цена вакцины», – *заверил министр.*

ТЕМ ВРЕМЕНЕМ

Сколько человек заболеют коронавирусом после концерта в «Минск-Арене»?

В минувшую пятницу в «Минск-Арену» почти со всех уголков Беларуси привезли людей на концерт по случаю Дня народного единства. И, судя по многочисленным фотографиям и телерепортажам, в масках было совсем немного людей.

И это в разгар очередного всплеска коронавируса!

И это при том, что в «Минск-Арене» давно введен масочный режим. Перед проходом на матчи контролеров обязали проверять у посетителей наличие средств индивидуальной защиты. Сообщалось, что при их отсутствии болельщикам может быть отказано в доступе на арену.

И это при том, что Минздрав рекомендует придерживаться масочного режима в местах массового скопления людей! Получается, на матч без маски нельзя, а на концерт – без проблем?

И это при том, что на дверях почти каждого магазина написано: посетители без масок не обслуживаются. Значит, в магазин без маски – это преступление, а на концерт – и так сойдет?

Или кто-то считает, что если в зале собрались сторонники лукашенковского режима и высокие чины, то к ним вирус не прилипнет?

А может, каждому приглашенному на это мероприятие делали ПЦР-тест или брали анализы на антитела?

Или только привитых из регионов привозили?

Почему министр здравоохранения об этом не говорит?

Почему представителям оппозиции из-за коронавируса не дают разрешения на проведение массовых акций, а сторонники власти их свободно проводят по поводу и без?

На футбольном матче между УВД Гродно и Минска по случаю дня города почти все болельщики в зале – без масок.

На минувшей неделе участницы конкурса «Мисс-Беларусь» и их семьи были на экскурсии во Дворце Независимости. Думаете, на фотографиях, которые опубликовал «Пул первого», есть хоть кто-то в маске?

Депутат и врач Людмила Макарина-Кибак уже переболела коронавирусом. В своем инстаграме она постит фотографии с форума «Молодость. Труд. Единство» и уточняет: *«Во Дворце Республики собрался самый большой в истории сводный студенческий отряд – 3 тысячи человек»*. На фотографиях в масках – единицы!

Почему?

А потом мы удивляемся, что цифры заболеваемости растут…

Даша ПАВЛОВСКАЯ.

ТОЛЬКО ЦИФРЫ

По данным Минздрава, за позапрошлые сутки в Республике Беларусь зарегистрирован 1941 пациент с COVID-19.

Берегите себя и будьте здоровы!

Народная Воля
http://www.nv-online.info
21 ВЕРАСНЯ 2021 г.

ЭКСКЛЮЗИВ

Валерий ЦЕПКАЛО:

«Страна падает в пропасть»

Какую партию создает Валерий Цепкало?
Не оторвался ли бывший дипломат, больше года живущий в Европе, от белорусской реальности?
Почему молчит Виктор Прокопеня?
Об этом и не только – большой разговор с экс-главой Парка высоких технологий ***Валерием Цепкало.***

Про деньги и греческое новоселье

– Вы сейчас живете в Греции, где нашла работу ваша жена Вероника. Как обустроились?

– Да, Веронике предложили работу. Мы приняли решение переехать, поскольку находимся на самообеспечении (так было всегда) и нужно думать, за что жить.

– Дорого обходится аренда жилья? Дом небось недалеко от моря?

– Не дороже, чем в Латвии. Мы пока арендуем квартиру на краткосрочной основе, поскольку определяемся со школой для детей, от этого и будем плясать. Важно, чтобы жилье было близко от школы. Афины – большой и сложный город, по разным оценкам, до 5 миллионов жителей, только порт километров десять в длину…

– В последнее время о вас мало слышно, даже стримы на YouTube-канале стали реже делать. Это связано с переездом или решили взять небольшую политическую паузу?

– Стримы приостановили и в связи с переездом тоже, но не только – сейчас заняты несколькими серьезными проектами. Скоро о них узнаете, это связано с будущим Беларуси. Или точнее – с Беларусью будущего. Стримы возобновим в ближайшее время.

– Расскажите, пожалуйста, как отреагировали представители белорусской оппозиции на ваше предложение подписать коллективное письмо к главам европейских государств и ряду американских политиков с просьбой пояснить, куда конкретно идут миллионы евро, выделенных белорусскому демократическому движению? Ваше заявление «Где деньги?» вызвало большой резонанс. А чем закончилась эта история?



– К сожалению, не могу ничем порадовать белорусов в этом отношении, но пока не хотел бы развивать эту тему, чтобы не переключать внимание от борьбы с главной причиной кризиса в Беларуси. Могу лишь сказать, что мы готовим законопроект по антикоррупционному законодательству и после смены режима будем уже в ультимативной форме, при поддержке народа, требовать от всех политиков поддержать его. Он касается обязательной отчетности всех политических сил за спонсорские деньги – как это принято во всех странах на Западе. Те, кто проект не поддержит, должны будут покинуть политику. Мы уже наелись лозунгов за 27 лет и не можем повторно ошибиться. Каждый без исключения белорус должен иметь возможность снимать плоды этой победы. Я лично и многие в моем штабе настроены очень жестко в отношении победы именно народа, а не отдельных личностей, которые просто хотят заменить собой Лукашенко.

– Ответил ли вам глава МИД Германии Хайко Маас, кто из белорусских политиков и представителей гражданского общества получил 21 миллион евро?

– Ответа пока не было, и мы не удивлены этим. На горячие речи поддержки и словесное разбрасывание денег все горазды, а как доходит до дела – в кусты. Мы обязательно вернемся к этим вопросам и щедрым на словах политикам, как только наступит подходящее время.

Про политиков, партии и переговоры с Лукашенко

– Только честно: как вы оцениваете теперешнюю деятельность лидеров белорусских партий? Есть мнение, что даже сейчас партийные лидеры могут немало делать – в рамках существующих законов, но некоторые предпочитают отмалчиваться…

– Смешно вообще говорить про партии. В Беларуси нет никакой партийной работы. Это просто пыль в глаза европейских политиков и народа.

– Руководитель вашего избирательного штаба Андрей Ланкин создает партию. Вы намерены войти в ее состав? Вообще, какие отношения у вас остались с Ланкиным? Не разошлись с ним в политических взглядах?

– Мы не общаемся с Андреем с тех пор, как он заявил о диалоге с режимом.

Мы сделали заявления о таких людях, как он, чтобы не было подмены понятий и отсылки к нашему штабу. Они все представляют только самих себя.

(Окончание на 4-й стр.)

ПАЛІТКУХНЯ

Мікалай КАЗЛОЎ:

«Офіс разблакіравалі, але пасляператрусу тут яшчэ тыдзень прыйдзецца прыбірацца…»

«Народная Воля» пацікавілася, што адказаў суд на скаргу старшыні Аб’яднанай грамадзянскай партыі ***Мікалая Казлова*** *і ці навялі ўжо парадак пасляператрусу ў партыйным офісе.*



Як паведамляла «Народная Воля», палітыка не так даўно асудзілі на тры месяцы арышту за разгалошванне дадзеных следства: падчас аднаго з допытаў у Следчым камітэце ён адмовіўся даць падпіску аб неразгалошванні. Пакуль Мікалай Казлоў знаходзіцца на свабодзе, бо рашэнне суда яшчэ не набыло законную сілу. Вядома, што каля месяца таму старшыня АГП абскардзіў прысуд.

– Я сам днямі прасіў адваката, каб яна пацікавілася, як рухаецца справа, – *гаворыць Мікалай Казлоў.* – Я напісаў скаргу ў раённы суд, а ўжо адтуль яе накіроўваюць у Мінскі гарадскі суд. Дык вось па стане на мінулы панядзелак мая скарга пакуль не была накіравана на разгляд. Ужо, між іншым, каля месяца прайшло, як я падаў скаргу. Пасля разгляду справы Мінскім гарадскім судом рашэнне ўступіць у законную сілу.

На мінулым тыдні стала вядома, што нарэшце разблакіравалі партыйны офіс АГП, які быў апячатаны пасля вобыску.

– Офіс працуе, мы маем да яго доступ, але тут усё дагэтуль разбурана і развалена, – *гаворыць Мікалай Георгіевіч.* – Сейфы зламаны, усё валяецца, камп’ютары распатрашылі, ноўтбук забралі. Мы яшчэ не прывялі ўсё да нармальнага стану. Пасляператрусу тут яшчэ тыдзень прыйдзецца прыбірацца. У нас і архівы, і іншыя паперы, папкі – усё скінута на падлогу. Персанальныя карткі сяброў партыі забралі, але навошта – не разумею. Думаю, проста на ўсялякі выпадак бралі тое, што траплялася на вочы.

Варта адзначыць, што менавіта нашай партыі гэты вобыск не тычыўся. Па нашым адрасе была зарэгістравана арганізацыя Анатоля Лябедзькі «Еўрапейскі дыялог», іператрус быў не ў нас, але забралі менавіта ўсю нашу дакументацыю. Мы падалі скаргу ў Следчы камітэт, бо, паколькі з’яўляемся афіцыйна зарэгістраванай палітычнай партыяй, павінны дзейнічаць паводле статута і выконваць свае функцыі.

Разам з намі быў прадстаўнік Следчага камітэта, які адчыніў офіс, пераканаўшыся, што за гэты час там нікога не было і што ўвесь гэты пагром застаўся, як яны пакінулі. Цяпер мы з гэтым усім тут разбіраемся. І ўсё не так проста: АГП – адна са старэйшых партый Беларусі, у нас шмат розная дакументацыя, таму цяпер тут трэба не проста падмесці, але і прааналізаваць, што засталося, а што вынеслі…

Марына КОКТЫШ.

ІНІЦЫЯТЫВА

Чым будзе займацца Акадэмія спартыўных менеджараў?

Як вядома, пасля выбараў мінулага года многія вядомыя беларускія спартсмены, якія выказалі сваю грамадзянскую пазіцыю, былі вымушаны з’ехаць за мяжу, каб не патрапіць пад рэпрэсіі. Сярод іх і прызёрка Алімпійскіх гульняў плыўчыха ***Аляксандра Герасіменя****.*

Зараз стала вядома, што гэтыя спартсмены плануюць адкрыць у бліжэйшы час акадэмію, якая будзе рыхтаваць спартыўных менеджараў.

«Гэтая ідэя лунала ў паветры даўно, – *распавяла Аляксандра Герасіменя аднаму з тэлеграм-каналаў.* – Мы ўсе разумелі, што ў Беларусі вялікая праблема з кіраўнікамі. Відавочна, што спорт у краіне павольна згасае, усе спрабуюць знайсці гэтаму прычыну. Кажуць пра тое, што дрэнная падрыхтоўка, няякасныя трэнеры, спартсмены. Але шукаць трэба глыбей.

Праблема не ў трэнерах і іграках, а ў кіраўніках, якія не разумеюць, што такое спорт, не ведаюць гэтую сферу знутры, не ўяўляюць, як кіраваць спортам, як знаходзіць спонсараў, як зрабіць так, каб людзі цікавіліся спортам, і, галоўнае, як прыцягнуць дзяцей да заняткаў спортам. Усё гэта вядзе да таго, што спорту як такога ў Беларусі проста не будзе.

Гледзячы на ўсё гэта, захацелася зрабіць так, каб па вяртанні ў свабодную Беларусь ужо былі людзі, якія гатовы ўсё мяняць. У выніку мы вырашылі стварыць акадэмію, дзе падрыхтоўку будуць праходзіць спецыялісты, якія ў будучыні змогуць прасоўваць беларускі спорт, менеджараў, якія будуць займаць кіруючыя пасады дзякуючы свайму прафесіяналізму, а не лаяльнасці да ўлады. Таму што мы выдатна бачым, да чаго прыводзіць сітуацыя, калі на пасадах сядзяць выключна тыя, хто выказвае такую лаяльнасць, а не свае прафесійныя якасці».

Паводле слоў Герасімені, на навучанне ў акадэмію пакуль што можа патрапіць любы жадаючы, які хоча развівацца ў спартыўнай сферы.



«Мы вітаем спартсменаў, якія хочуць развівацца ў новым для сябе кірунку, ужываючы на практыцы атрыманыя за гады кар’еры веды, – *дадае Аляксандра.* – Таксама курс будзе цікавы тым, хто не быў раней звязаны са спортам, але ім цікавая гэтая сфера, яны хочуць паглыбіцца ў праблематыку, хочуць у далейшым кіраваць спартыўнымі арганізацыямі, клубамі».

Афіцыйна акадэмія з’явілася 1 верасня, але курс стартуе з 1 кастрычніка. Навучанне ў рэжыме анлайн будзе доўжыцца 12 тыдняў, за курс навучання трэба заплаціць 250 еўра.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
21 ВЕРАСНЯ 2021 г.

ЭКСКЛЮЗИВ

Валерий ЦЕПКАЛО:

«Страна падает в пропасть»

(Окончание. Начало на 3-й стр.)

Если ты претендуешь на то, чтобы называться политиком, ты должен прямо ответить на вопросы, которые волнуют всё общество: как ты относишься к фактам убийства мирных граждан и покровительству убийц, как относишься к пыткам, избиениям и незаконным посадкам в тюрьмы белорусских граждан? Считаешь ли ты, что белорусы имеют возможность выбирать себе руководителя на выборах или что кто-то может подделывать волеизъявления граждан и сажать политических оппонентов? Мы никогда не пойдем на диалог с Лукашенко. Любые переговоры с ним – это предательство народа и капитуляция.

Что касается партии, которую создает Ланкин, то я об этом не слышал. Речи не может быть о вступлении в какую-либо другую партию, кроме «Беларуси Будущего», которую мы зарегистрируем сразу после победы.

– Объясните, почему вы не поддерживаете идею переговоров с Лукашенко?

Справу разглядала суддзя **Таццяна Аземша**. Выслухаўшы бакі і агучыўшы матэрыялы справы, суддзя на паўгадзіны выйшла ў дарадчы пакой, а потым агучыла рашэнне: ліквідаваць маладзёжную краязнаўчую грамадскую арганізацыю «Талака» з прычыны непрадастаўлення ў адпаведнасці з артыкулам 24, часткай 6 закона звестак у рэгіструючы орган – галоўнае ўпраўленне юстыцыі Гомельскага аблвыканкама.

– Вельмі шкада арганізацыю, – кажа маладая гамяльчанка Лідзія Лешчанка, колішні маршалак «Талакі». – *Гэта некалькі гадоў жыцця, калі душа спявала. Але ў цяперашняй сітуацыі нічога не зробіш.*

Некаторыя іншыя актывісты лічаць, што ў справе ліквідацыі спрацавала псіхалогія, чалавечы фактар.

– Людзі стомлены ў цяперашніх беларускіх рэаліях. Барукацца з несправядлівасцю ўжо не стае сіл. Здаецца часам: ай, гары яно гарам! Можна яшчэ апеляцыйную скаргу падаваць, але гэта як біцца галавою ў няздломную сцяну. У прынцыпе, «Талака» – цудоўная з'ява, рух моладзі, які змяняў светапогляд, далучаў да беларушчыны, да разумення важнасці нацыянальнай культуры. Гэта нікуды не дзенецца і не залежыць ад рэгістрацыі ці ліквідацыі, – лічыць **Марыся Тульжанкова**.

Па ўсёй Беларусі з сярэдзіны лета вядзецца зачыстка – масавая ліквідацыя недзяржаўных асветніцкіх, прафесійных, дабрачынных, даследчыцкіх арганізацый. Іх прадстаўнікоў затрымлівалі, праводзілі вобшукі ў іхніх домах і ў офісах, арыштоўвалі рахункі.

Пытанне існавання грамадзянскай супольнасці ўзнімаў Аляксандр Лукашэнка на нарадзе з кіраўніцтвам Савета міністраў: *«Так і ўрад, і МЗС пабеглі за «дэмакратыяй» і паставаралі ў нас... пад 2 тысячы на невялікую краіну НДА, НКА, бандытаў і замежных агентаў».*

У выніку па стане на сярэдзіну верасня, паводле звестак праваабаронцаў, ліквідавана ўжо 135 недзяржаўных арганізацый. Да іх ліку 15 верасня дадалася гомельская «Талака».

– Рашэнне суда яшчэ і не набыло юрыдычную моц, але «смяротнае пакаранне» ўжо вынесена, – лічыць грамадскі актывіст і палітык **Васіль Палякоў**. – *Няма суразмернасці пакарання таму, што парушана. Талакоўцы не падалі ва ўпраўленне юстыцыі справаздачы. Гэта ж – не дай, Бог! – не якая-небудзь экстрэмісцкая дзейнасць. «Талака» займалася прасоўваннем нацыянальнай культуры, а яе адразу ліквідавалі, хоць можна было на нейкі час дзейнасць толькі прыпыніць. Я ўжо не кажу пра нагрувашчванне недарэчнасцяў у беларускім заканадаўстве аб грамадскіх аб'яднаннях. Дзяржава мусіць спрыяць свабодзе і праву грамадзян на асацыяцыі, іх лучнасці, а не вынішчаць усё гэта.*

Колішні старшыня «Талакі» **Яўген Меркіс**, які таксама прысутнічаў на судзе, перакананы, што зачэпку знайшлі б у любым выпадку, нават калі б талакоўцы своечасова справаздачыліся, падавалі дакументы ва ўстаноўлены тэрмін. Бо ў краіне вядомы ўжо выпадкі, калі *«некамерцыйныя арганізацыі ліквідавалі за тое, што яны не займаюцца камерцыйнай дзейнасцю».*

– Што ўжо казаць пра «Талаку»! – дадае Яўген. – *Выглядала, што нават для суддзі беларускія словы «скарбнік», «талака», «маршалак» выглядалі дзіўнымі і незнаёмымі.*

І сапраўды, «маршалак» вымаўляўся з націскам на апошнім складзе – «маршалок», а назва арганізацыі «Талака» на сярэднім – «Талока».

Анатоль ЛІПСКІ.

СТАТИСТИКА

БПС-Сбербанк выяснил, кто ездит на минских электричках

БПС-Сбербанк собрал статистику по бесконтактной оплате проезда в поездах городских линий в летние месяцы.

Летом через валидаторы в вагонах пассажиры оплачивали около 30 тысяч поездок в месяц. Такая возможность появилась в июне 2019 года, когда технологию запустили на городских линиях Белорусской железной дороги. С тех пор ее популярность значительно выросла: если летом позапрошлого года сервисом воспользовались почти 22 тысячи пассажиров, то за нынешний сезон отпусков – уже более 85 тысяч.

Бесконтактная оплата проезда в поездах городских линий БелЖД набирает популярность. В сравнении с прошлым летом рост числа транзакций составил 37 процентов, а с позапрошлым – увеличился почти в 4 раза. Всё больше пассажиров, среди которых и гости страны, предпочитают не тратить времени на поиск точки продажи билетов, а рассчитываются за проезд в самом вагоне. *«Так быстрее и проще, и это формирует облик современных пассажирских перевозок по железной дороге»,* – отметила исполнительный директор БПС-Сбербанка **Марина Осиповская**.

Согласно статистике бесконтактных оплат БПС-Сбербанка, больше всех поездами городских линий пользуются сами белорусы – около 95 процентов пассажиров. На втором месте – жители России, на третьем – Польши. Пассажиры из других стран встречаются реже.

Проезд можно оплатить картами Visa, Mastercard и БелКарт любого банка. Это также можно сделать с помощью смартфона, умных часов, платежных браслетов и брелоков с поддержкой NFC. Для расчета надо приложить банковскую карту к валидатору, оплата происходит за доли секунды.

Цена проезда при бесконтактной оплате в поезде аналогична стоимости билета в кассе. По одной карте можно рассчитаться за 5 пассажиров.

Бесконтактную оплату проезда БПС-Сбербанк развивает вместе с Белорусской железной дорогой и международными платежными системами Visa и Mastercard. Технология доступна в поездах городских линий в первой тарифной зоне (Минск–Беларусь, Минск–Михановичи, Минск–Городище) и в столичном метро.

КАК ЭТО БЫЛО...

В первые же дни убили священника с семьей

Как 17 сентября изменило жизнь христиан в Западной Беларуси

В Пинске подожгли православный собор, а епископа отправили подметать улицы. Что еще происходило с Православной церковью после присоединения Западной Беларуси к БССР?

К очередной годовщине ввода Красной Армии на территорию Польши 17 сентября 1939 года и присоединения Западной Беларуси к БССР сайт *katolik.life* подготовил материал о том, как это событие изменило жизнь христианских верующих региона.

Мы специально не будем упоминать о многочисленных взорванных и разоренных католических храмах Западной Беларуси, арестованных священниках, репрессированных верующих. В этом материале мы лишь приведем выдержки из работы сотрудника Института истории Национальной академии наук Беларуси, кандидата исторических наук, доцента **Александра Цымбала** «Положение православной церкви в Западной Белоруссии в 1939–1941 годах» (Западная Белоруссия и Западная Украина в 1939–1941 гг.: Люди, события, документы. СПб., 2011).

В результате раздела Польши между Германией и СССР Западная Белоруссия и Западная Украина были заняты советскими войсками, пишет автор. И констатирует, что *«с установлением советского режима в западных областях Белоруссии в сентябре 1939 года религиозная жизнь претерпела существенные изменения»*. Он рассказывает только о жизни Православной церкви, которая под польской властью достаточно свободно действовала в Западной Беларуси.

«Большевики застали в Западной Белоруссии религиозную жизнь хорошо организованной. В отличие от восточных областей, где были закрыты все церкви, не существовало ни одной епархии и не было ни одного епископа, в западных областях в 1940 году насчитывалось 542 церкви и 606 священников».

Срывали с храмов кресты, жгли на кострах иконы


Конкретно о Беларуси автор пишет:

«Наступление на церковь советская власть начала с уничтожения материальной базы церкви и духовенства. Уже 29 октября 1939 года было объявлено о национализации церковной собственности. В соответствии с практикой Восточной Белоруссии межвоенного периода предпринимались шаги по изъятию храмовых ценностей, колоколов, обложению духовенства завышенными налогами (...) Ликвидировались позиции церкви в сфере образования. Были закрыты все духовные учебные заведения, запрещалось преподавание Закона Божьего в школе».

Одним из приемов стало шельмование духовенства в статьях, памфлетах и карикатурах

Далее в тексте: *«Одним из приемов атеистической атаки на религию и церковь стало шельмование духовенства в статьях, памфлетах и карикатурах. Эта «традиция» началась в 1930-е годы, когда «воинствующие безбожники», подогреваемые массированной сталинской пропагандой, срывали с храмов кресты, жгли на кострах иконы, богослужебные книги, церковную утварь».*

В 1940 году Центральный совет СВБ БССР совместно с ЦК КП(б)Б, ОК ЛКСМБ, ЦК ЛКСМБ провел в западных областях Белоруссии четыре трехдневных семинара в Белостокской, Брестской



и Барановичской областях с охватом 155 человек. Сюда была направлена пропагандистская литература: «Церковь панской Польши», «15 лет СВБ», «Об антирелигиозной работе в западных областях Белоруссии и Украины», «Православные обряды и их вред», «Миссионеры на службе империализма».

Считая епископа Александра тунеядцем, заставляли его подметать улицы

Вот о чем еще говорит историк: *«Несмотря на некоторую осторожность в религиозной политике, советская власть применяла и репрессивные методы борьбы с религией, а порой действия партийцев, комсомольцев и красноармейцев содержали в себе откровенное издевательство над духовенством и верующими.*

Например, на второй день пребывания в Пинске красноармейцы подожгли Свято-Федоровский собор и стреляли в него из ружей. Вдоволь наглумившись над храмом, они решили отобрать церковную мебель.

Когда члены церковного комитета Анна Полюхович, Борахова и Сыроватко (имена неизвестны) потребовали прекратить самоуправство или предоставить документы на конфискацию имущества, их арестовали. Издевались красноармейцы и над епископом Александром. Считая его тунеядцем, они заставляли архипастыря подметать улицы.

В первые дни установления советской власти были убиты: протоиерей Андрей Куц с семьей в Шиловичах, священник Боровский в деревне Лаши в Левшове, священник Каминский убит около Свислочи. В Жижме Лидского благочиния был застрелен священник Евграф Бука».

Новая власть лишила возможности православных верующих посещать богослужения в дни больших праздников. Так, в Давид-Городке на местном кирпичном заводе в день Успения не вышли на работу 32 человека. Материал на этих людей был передан в судебные органы.

«Проводить агентурно-разложительную работу, которая должна привести к дроблению сект и развалу церковной работы»

Органы НКВД активно боролись с влиянием духовенства на народные массы и с самим духовенством. В деревне Фасти Белостокской области председателем крестьянского комитета был выбран дьякон Бакун. Вскоре священник был арестован.

2 декабря 1939 года во все областные отделения НКВД была разослана «оперативка», в которой указывалось: *«Учитывая, что церковный к-р.* (контрреволюционный) *актив – попы, ксендзы, раввины и другие служители религиозного культа – будут пытаться использовать религиозные предрассудки населения в к-р. целях, НКВД БССР предлагает: 1.Немедленно направить агентуру на выявление и вскрытие организованной антисоветской деятельности церковников и прочего к-р. элемента... 4.Наряду с агентурно-оперативными мероприятиями по к-р. формированиям среди церковников и сектантов необходимо проводить агентурно-разложительную работу, которая должна привести к дроблению сект и развалу церковной работы».*

Автор перечисляет многочисленные репрессии в отношении священников и завершает работу такими сведениями: уже в 1940 году государственная религиозная политика начинает постепенно ужесточаться. А в июне 1941-го, за несколько дней до начала войны, в статье «Патриотизм и религия» (опубликованной в журнале «Безбожник») утверждалось: «Религия является злейшим врагом советского патриотизма...»

ТРАДЫЦЫІ



Хлеб, які пяклі спрадвеку

Традыцыя выпякання хлеба ў вёсках Жораўка і Кузьмічы Любанскага раёна нядаўна афіцыйна была ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі ў якасці нематэрыяльнай праявы творчасці чалавека.

Жораўскі хлеб стаў візітоўкай Любаншчыны дзякуючы дзейнасці Ірыны Жудрык і створанаму ёй аматарскаму аб'яднанню «Клуб традыцыйнага хлебапекарства «Кулітка» пры Жораўскім доме народных традыцый.

Жнівень... Ужо сама назва гаворыць, што асноўны клопат месяца – жніво, уборка збожжа. Залатыя каласкі потым лягуць на наш стол духмяным боханам. І ў полі, і ў хаце хлеб спрадвеку быў ахутаны нашымі продкамі вялікай павагай і пачцівасцю. «Адзіны хлеб не прыядаецца», – кажа народная мудрасць. Таксама і да хлебапёкаў адвеку ставіліся з асаблівай пашанай. Бо хлеб быў не проста ежай, ён меў важную сакральную функцыю: пышны каравай – галоўны ўдзельнік большасці абрадаў на народным свяце, хлебам-соллю сустракалі дарагіх гасцей і пасля вянчання маладых, лустачку хлеба клалі памерламу ў труну...

Быць адмысловым пекарам – талент, які патрабуе адмысловых ведаў і светлай душы, казалі на вёсцы раней. Пра Ірыну Міхайлаўну Жудрык сёння ведаюць не толькі ў Беларусі, але і за мяжой як пра адметнага хлебапёка: яна захавала і аднавіла традыцыі выпечкі хлеба па старадаўніх беларускіх рэцэптах.

– *З маёй радні ўсе ўмелі пячы хлеб: і мае цёткі, і маці, якая стала для мяне першай дарадчай (ёй ужо амаль 90 гадоў). Сямейны рэцэпт хлеба перадаваўся з пакалення ў пакаленне,* – расказвае Ірына Міхайлаўна. – *У суседнюю з Жораўкай вёску Барок я пераехала, калі выйшла замуж. Мне спачатку здалося, што тут няма традыцый свойскага хлеба. Аднак на справе выйшла інакш, хлеб пяклі і тут...*

З дзяцінства Ірына пільна назірала за сваёй маці, калі тая завіхалася ля печы. Большасць рэцэптаў маці прыдумала сама, бо яе матуля вельмі рана пайшла з жыцця і дзяўчынцы не было ў каго вучыцца. А хлеб у вёсцы тады пяклі пастаянна, рэдка куплялі яго. Вядома, іншы раз дзяцей бацькі адпраўлялі ў краму, тыя беглі з радасцю – на рэшту ім дазвалялася купіць падушачак (невялікіх квадратных цукерак без абгорткі). Ірына ім зайздросціла, у яе сям'і елі толькі свой, дамашні, хлеб.

Пяклі яго звычайна ў выхадныя ў разліку на ўвесь тыдзень, бо ў будныя дні людзі былі заняты на працы і гаспадарцы. У іх вёсцы не ва ўсіх меліся бляшаныя падкладкі для выпечкі. А хлеба патрабавалася шмат – сем'і былі вялікія. Выйсце знаходзілася простае:



сёння напякуць удосталь хлеба для сябе, назаўтра перадаюць посуд іншым.

А некаторыя рабілі выпечку на адчышчаных да глянцу гарачых цаглінах, якія высцілалі кляновымі, дубовымі лістамі, аерам. Усімі гэтымі рэцэптамі валодае Ірына Міхайлаўна і папаўняе іх спіс пачутымі ад іншых жанчын.

Выпечка хлеба – гэта сапраўды патаемны рытуал, які патрабаваў уважлівасці пры кожным руху і... цішыні. Калі падыходзіла цеста і хлеб саджалі ў печ, нельга было шумець, гучна размаўляць. Таму дзяцей часта праганялі на вуліцу ці зачынялі ў іншым пакоі. Яшчэ лічылася, што, калі хлеб ставіцца ў печ, не варта нікога пускаць у хату, інакш сям'я можа пазбавіцца дабрабыту.

...Водар свежага духмянага хлеба сустракае кожнага яшчэ на подступах да невялікай драўлянай хаткі, у якой месціцца Дом народных традыцый. Ад круглых кулітак (так тут называюць бохан хлеба) зыходзіць прыемная пахучасць – так і хочацца хутчэй паспрабаваць хрусткую скарыначку.

Падаючы кулітку, Ірына Міхайлаўна растлумачвае гасцям працэс выпечкі дамашняга хлеба:

– *Патрэбна амаль двухдзённая падрыхтоўка. Спачатку робіцца закваска. Калі зімой у хаце халаднавата, то трэба, каб не менш як суткі яна пастаяла, а летам хапае і паловы сутак. Калі закваска паднялася, то можна пачынаць мясіць цеста. Старажылы казалі, што, каб хлеб быў правільны, яго трэба пераямясіць столькі разоў, колькі дзён у годзе!*

Ірына Міхайлаўна прызнаецца, што выпечка хлеба – справа адказная, важна не пралічыцца з тэмпературай печкі, каб атрымаць тую самую ідэальна хрусткую скарыначку. Дровы павінны цалкам выгарэць, каб не засталося ніводнага ярка-чырвонага вугольчыка, каб адзін толькі гарачы дух захаваўся...



Рэцэптура тамтэйшага хлеба даволі простая: мука двух гатункаў – жытняя і пшанічная, малочная сыроватка (або проста вада ў пост), соль, прыправы і дадаткі. Інгрэдыенты злучаюцца ў залежнасці ад віду хлеба, які выпякаецца. Іх існуе некалькі: сітны – штодзённы; пшанічны – калядны і святочны; хлеб з дадаткамі і прысмакамі; хлеб партызанскі, які пяклі ў галодны ваенны час (у яго складзе былі размолатыя жалуды, саламяная церуха, кара дрэў і інш.).

Закваска ставіцца на ноч з адным гатункам мукі, раніцай падмешваецца другі гатунак, дадаюцца інгрэдыенты. Сёння гэта могуць быць насенне чарнушкі, кмен, каляндра, кроп. У якасці дадаткаў выкарыстоўваецца таксама сушаныя чарніцы, сушаныя яблыкі,



сушаныя грушы, «гарбузікі» – ачышчаныя семкі гарбузоў, сырая надраная або вараная і тоўчаная бульба.

Пасля ўсіх дадаткаў цеста «выходжваецца» яшчэ на працягу некалькіх гадзін у залежнасці ад тэмпературы ў пакоі. Потым яно дзяліцца на кавалкі, з якіх фарміруецца кулітку. Боханы летам садзяць на лістах клёна, дуба або на разасланы аеры. Іншы раз выкарыстоўваюцца не патэльні, а драўляныя кружочкі, абітыя бляшанкай.

Разам выпякаюцца таксама «скавародкі», ці «перапечкі», – невялікія круглыя блінцы з хлебнага цеста. Яны гатуюцца вельмі хутка. Цеста прымінаецца на патэльні і пракалваецца пальцамі, каб «не ўставала», перапечкі могуць пячыся перад агнём, у той час як боханы-кулiткі – толькі «ў духу».

Нядаўна ў Жораўцы адрадзілі і старадаўні рэцэпт вясельнага каравая. Збіралі інфармацыю па крупінках, распытвалі старажылаў-бабуль. Гэта ж раней быў цэлы абрад: рыхтаваць каравай павінны былі толькі замужнія жанчыны і абавязкова тыя, хто шчасліва жыве ў шлюбе. Прыносілі кожная па чуць-чуць: хто муку, хто яйкі, хто малако. А цеста павінны былі мясіць толькі далонькамі, а не кулакамі – інакш у шлюбе муж будзе біць жонку. Пакуль падыходзіла цеста, жанчыны спявалі песні, дапамагалі маладзі збірацца нявесту...

Дзякуючы Ірыне Міхайлаўне Жудрык такая, здавалася б, будзённая справа, як выпечка дамашняга хлеба, стала прыцягальнай экзотыкай для турыстаў.

– *Я вельмі хацела стварыць клуб хлебапёкаў, проста трызніла гэтым,* – дзеліцца Ірына Міхайлаўна. – *Але ў сваім доме апошнім часам печы ў мяне ўжо не мелася. На адным з вясковых святаў пра маю мару даведаўся загадчык арганізацыйна-творчага аддзела Любанскага раённага цэнтра культуры Сяргей Выскварка. Ён адразу падхапіў маю ідэю, адразу сказаў: гэта будзе ўнікальны культурны праект! Набылі пад наш клуб хлебапёкаў старую хату, зрабілі там рамонт. Афармлялі ўсёй вёскай: хто мэблю старадаўнюю падарыў, хто ручнікі, хто прынёс калаўрот, хто маслабойку. Столькі ўсяго цікавага знайшлі! Цяпер гэтыя рэчы – частка інтэр'ера нашага аматарскага клуба. І сталі мы тут пячы хлеб такі, як пяклі спрадвеку ў беларускай вёсцы.*

Алена ВАСІЛЬЕВА.
Фота Альфрэда МІКУСА.
«Алеся».

РЕДКИЕ ЛЮДИ

Вокруг света на хэндбайке

***Саша Авдевич**, блогер-колясочник из Лиды, отправился в дальнее путешествие вокруг света и планирует открыть на Тенерифе кафе и хостел, где будут работать люди с инвалидностью.*

Инвалид-колясочник, блогер и активист из Лиды (Гродненская область) Саша Авдевич месяц назад отправился в кругосветное путешествие. На данный момент он уже проделал путь из Тбилиси до Стамбула на велосипеде с ручным управлением. Дальше маршрут лежит через Грецию, Италию и Испанию на остров Тенерифе, где Авдевич планирует открыть инклюзивное кафе и отель. Но Тенерифе будет точно не последним пунктом его кругосветки. О том, как задумывалось и как проходит его путешествие, Саша Авдевич рассказал в интервью *DW*.


© privat

– Саша, как и когда родилась идея путешествия вокруг света?

– Идея родилась года два назад. Я тогда работал в Программе развития ООН, у меня была должность представителя по вопросам интеграции людей с инвалидностью. И так как часто были командировки, я понимал, что всё точечно, неясно и нет какого-то общего формата в плане людей с инвалидностью...

Я понимал, что у меня нет общей картины. И очень долго можно троллить ту же Беларусь в плане доступности *(безбарьерной среды. – **Ред.**)*, но ты приедешь в Грузию и поймешь, что Беларусь вообще идеальна. У меня до этого было уже путешествие из Минска до Португалии, и вот как-то у меня зародилась идея сделать такой world inclusive trip – вот такое название мне пришло в голову. Так я начал об этом думать, готовиться, откладывать деньги на всю эту историю.

У меня заканчивался контракт в марте 2020 года, и я думал уже в марте и стартовать. Но тут как раз наступило время ковидной истории, локдаунов, начали закрываться границы. И когда уже закрылась Европа, я думал: поеду через Украину. Если там откроется, поеду через Европу, если не откроется, то через Россию. Я уже слишком долго готовился, не видел никаких препятствий ни в чем.

И вдруг в последние дни закрывается сначала Украина, потом Россия, и я понимаю, что никуда не еду. У меня начинается такой период, когда я не знаю, куда же себя применить. И, чтобы не потратить всё, что собирал и откладывал на путешествие, я на эти деньги открываю в Минске первую инклюзивную кофейню «Инклюзивный бариста». За год у меня получилось неплохо развиться, мы открыли уже пять заведений.

– И когда ты вернулся к идее путешествия?

– За этот год я второй раз сломал спину, пролежал в больнице. И когда лежал, думал: какое путешествие, вряд ли уже что-то получится. Ну прямо ничего уже не двигалось. А потом как-то вышел из больницы, начал потихонечку реабилитироваться, работой заниматься, было очень много текучки с кофейнями. Я забивал на всякие таблетки-больницы, ходил на работу. А потом, когда первый раз пересел на велосипед – это было в начале июня этого года, – я понял, что, может, получится и с путешествием.

И потом, когда пару раз у меня получилось пересесть, поставить коляску, приехать домой и на работу, я понял, что если сейчас не стартану, то вообще никогда уже это не произойдет. Конечно, в этот момент начинаются какие-то проблемы с договорами, бухгалтер подает в суд на контору. А у меня еще директор – парень с синдромом Дауна, Вася Павликов. «На кого ты оставишь бизнес?» – говорят мне. Я отвечаю: «На Васю. Вася – директор». Все: «Как на Васю?» Все начинают больше переживать, чем я. В чем проблема? Все зарплату получают, если что-то и закроется, то, значит, такая судьба.

– Откуда ты решил начать путешествие?

– Куда едет вся Беларусь? Только Грузия, по-другому никак нельзя было выехать. И я уже настолько авантюрно был настроен, что просто купил билет до Тбилиси и 23 дня назад стартанул оттуда. Очень боялся перевалов. На самом деле оказалось, что в Грузии еще нормально, все приколы начались в Турции. Каждый день я веду свой видеоблог, пытаюсь делать из этого хороший фильм, соответственно посещаю и останавливаюсь в куче разных мест, которые на 98 процентов абсолютно недоступны. Если это не отель уровня Hilton, Sheraton в Батуми, то даже не надейтесь. И если у тебя не построена коммуникация, то однозначно ты не попадешь ни в один отель. Пытаюсь об этом всем рассказывать, что-то улучшать.

– Есть ли какой-то маршрут путешествия?

– Путь я держу до Тенерифе. Почему Тенерифе? Когда еще я был в первом путешествии, люди говорили: ты должен обязательно приехать на Тенерифе и заехать на вулкан. Вот с того момента мне запомнилось, что все велосипедисты почему-то хотят заехать на этот вулкан. Это раз. А второе – у меня друг уехал тогда, когда начался весь этот кризис в Беларуси. И он там какие-то подработки ищет, строит такие купольные домики чуть ли не из пенопласта. Короче, хочет там свой город солнца создать. У меня, естественно, есть идея продолжить историю с «Инклюзивным бариста».

Почему нет? Это большой европейский курорт, там постоянно есть люди. Тенерифе будет первой точкой в этом мировом путешествии, но не последней. Идея в том, чтобы собирать донаты, искать подработки, чтобы там открыть очередную точку «Инсклюзивный бариста» и, возможно, сделать какой-то хостел. Вообще, глобальная идея – чтобы было так, что любой человек на коляске мог приехать поработать там и пожить. Не обязательно инвалиды, более глобально. Просто чтобы это было большое инклюзивное место, где удобно и комфортно всем. И вот это, о чем я сейчас говорю, рождается в процессе моего движения, и в этом, наверное, красота всего происходящего.

– А как ты будешь искать людей с инвалидностью на Тенерифе?

– А мне не обязательно искать людей с инвалидностью, я могу их туда пригласить, могу бросить клич в социальных сетях, на местных новостных порталах. Это такой маленький остров, типа как Минск вокруг растянуть – получится Тенерифе. Меня волновал, естественно, климат, потому что я сейчас добираюсь на коляске. Это раз, и второе – развитая инфраструктура. Там нет дождей, всё реально в порядке, и это вселяет надежду, что качество жизни может быть намного более крутым.

– Как планируешь туда добираться?

– Паромом. У меня после Стамбула будет Греция, после Греции – маленький паромчик в Италию. Потом будет паром до Испании, и по Испании я доеду до крайней точки. Я думал через Африку ехать, через Марокко, но кто его знает, это же такой фристайл! Возможно, я на самолете полечу. А может, мы на подводной лодке поплывем.

Это и есть настоящее путешествие. Возможно, я заеду еще в три города, мне там что-то понравится, и я останусь там пожить. Безусловно, у меня есть конечная цель, мне очень хочется туда добраться, но если вдруг что-то появляется, что я сочту интересным в своем world inclusive trip, то почему бы не использовать момент?

– Какие сложности есть в таком путешествии?

– Вчера был очень тяжелый день, потому что я ехал через горные перевалы. Я проехал две большие горы, подъем и спуск на метров 800, наверное. Потом проехал через маленький городок и начал снова подниматься в горы. И вдруг дорога сузилась так, что рядом могут проехать только две машины.

И вместо двух машин постоянно идет караван КамАЗов, МАЗов, везут песок, деревья. В какой-то момент эти все КамАЗы разгружаются, высыпают песок. Стоит полицейский, и он меня тормозит, говорит: «Остановись пока здесь». Когда до него доходит, что я вообще на коляске, он, наверное, подумал, что его снимает какая-то скрытая камера.

– Какая главная цель твоего путешествия?

– Главная цель – испытать себя, показать, что это возможно, показать, что человек с инвалидностью, казалось бы, в самом заброшенном месте – не что-то, для чего нужно готовить целый проект, 10 сопровождающих, 500 бухгалтеров и 100 миллионов долларов. Человек, в принципе, может делать это сам, и это нормально. Наверное, доказать и миру, и самому себе. Естественно, добраться до конечной точки и построить свое кафе, свой отель. Посыл такой: the future is inclusive *(будущее инклюзивно. – **Ред.**)*. Я хочу, чтобы это было сегодня, а не когда-то завтра.

ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ



з Алесем СІВЫМ

Падсцяліў саломку

Днямі старшыня Беларускай федэрацыі футбола **Уладзімір Базанаў** разважаў на тэлебачанні пра перспектывы віду спорту, якім ён кіруе, і нарэшце супакоіў балельшчыкаў, якія ўжо не першы год задаюцца даволі няпростым пытаннем: ці ажыве нябожчык? Маю на ўвазе «поспехі» нацыянальнай зборнай, пра якую апошнім часам варта казаць або добра, або нічога.

Дык вось палкоўнік Базанаў, які раней быў ваенным камісарам Брэсцкай вобласці, па-ваеннаму коратка і дакладна акрэсліў, калі ў Беларусі надыдзе светлая футбольная будучыня.

«Калі мяркуем атрымаць жаданы вынік? – задумаўся кіраўнік федэрацыі. – *Я думаю, гадоў праз 6–8, раней не будзе».*

Што і казаць, ход з боку футбольнага функцыянера вельмі моцны. Па-першае, у бліжэйшыя 6–8 гадоў спартыўныя чыноўнікі ад футбола могуць спаць адносна спакойна, бо, паводле іх планаў, раней перспектывы практычна нулявыя.

Па-другое, не трэба адказваць розным крытыканам на яшчэ адно няпростае пытанне: чаму ў Беларусі футбол апошнім часам дэградуе? Калі раней і БАТЭ перамагаў «Баварыю», і нацыянальная каманда магла згуляць са зборнай Францыі ўнічыю, то зараз мы ўжо не здзіўляемся паражэнням ад клубаў з Люксембурга і ад бельгійцаў з фантастычным лікам 0:8. Але ж у запасе ёсць яшчэ восем гадоў!

Па-трэцяе, праз восем гадоў у федэрацыі, магчыма, ужо не будзе ні Базанава, ні іншых яго калег. І той жа Базанаў можа апусціць вочы долу і ціха сказаць: нешта пайшло не так… А новае кіраўніцтва, не выключана, акрэсліць новыя тэрміны надыходу светлай будучыні: *«праз 6–8 гадоў, не раней».*

Дарэчы, футбольных тэарэтыкаў у федэрацыі, мяркуючы па ўсім, і на самай справе назбіралася цэлая каманда, якая проста фантаніруе ідэямі. Іх бы энергію ды на футбольнае поле!..

Яшчэ ў сакавіку Беларуская федэрацыя футбола прадставіла 108-старонкавую «Канцэпцыю развіцця беларускага футбола да 2028 года», якая вызначае працэс *«на падставе грамадска-дзяржаўнага партнёрства».*

Там нават расклалі па палічках правал задачы выхаду на чэмпіянат Еўропы і нявыхад у групу B Лігі нацый. Недахоп прафесіяналізму футбалістаў ідзе там трэцім пунктам, пралікі трэнерскага штаба – пятым. А вось першыя два: *«адсутнасць адзінага патрыятычнага духу каманды»* і *«адсутнасць сістэмнага падыходу па суправаджэнні нацыянальных і зборных каманд».* Адным словам, будзе патрыятызм – Кубак свету практычна ў кішэні! А калі кожную каманду ўзмацніць ідэалагічным суправаджаючым, дык увогле ці знойдзецца на зямным шары ліга, вартая нашай зборнай? А трэніроўкі і трэнерскія кадры – справа пятая.

Праўда, падобна на тое, што футбольныя функцыянеры ўпэўнены: у бліжэйшыя 6–8 гадоў з «патрыятычным духам» будуць пэўныя праблемы. Бо ў той жа канцэпцыі развіцця зборнай запланавана патрапіць на чэмпіянат свету толькі ў 2028 годзе і там заняць месца ў дыяпазоне з 17-га па 22-е. Дасціпнікі жартуюць: «Цікава, ці будзе лічыцца правалам, калі раптам зоймуць, скажам, 14-е месца?»

Адным словам, у бліжэйшыя восем гадоў аматарам футбола можна расслабіцца – «кіна не будзе». Зараз застаецца толькі рабіць стаўкі на тое, ці «дажывуць» на сваіх пасадах да светлай будучыні распрацоўшчыкі канцэпцыі. Ёсць меркаванне, што іх папруць ужо ў бліжэйшай перспектыве…

УСМІХНІЦЕСЯ…



Гэтым летам вельмі папулярнай стала кніга адной маладой пісьменніцы «Як знайсці мужчыну сваёй мары і што потым рабіць з гэтым падонкам».



– Юля, запомні! Трэба заўсёды ўсміхацца: камусьці – шчыра, а камусьці – на злосць.



Разумнаму чалавеку два разы паўтараць не трэба. Разумнік цябе ўжо пасля першага разу пашле куды падалей.



Мільёны падлеткаў хочуць выратаваць нашу планету ад забруджвання. Мільёны бацькоў хочуць, каб яны пачалі з гэта рабіць са свайго пакоя.



Жонка кінула мяне з трыма малалетнімі дзецьмі (старэйшым 7 і 4 гады, малодшаму тры тыдні) і сышла на кухню піць гарбату. Што мне рабіць?



– Максім, а давай пажэнімся!
– Давай! Толькі ты першая.

БУДЬТЕ ЗДОРОВЫ!

Медики назвали лучший чай для здоровья мозга

Утром много людей предпочитают пить кофе, но исследователи из Швейцарии рекомендуют переходить на зеленый чай, поскольку этот напиток гораздо полезнее для здоровья, в частности он улучшает мозговую активность, пишет u-news.com.ua.

Автор исследования **Стефан Боргвардт** подчеркнул, что в составе зеленого чая есть большое количество антиоксидантных веществ, которые борются в организме со свободными радикалами, защищая его от развития серьезных заболеваний.

Согласно исследованиям, этот напиток помогает в лечении психических расстройств, таких как слабоумие. Он способен увеличить краткосрочную синаптическую пластичность мозга, благотворно влияя на его когнитивные функции.

Отметим, что зеленый чай, в составе которого много витаминов и микроэлементов, в частности кальция, магния, железа, фосфора, натрия, увеличивает концентрацию дофамина (гормона счастья) в организме. Одновременно он снижает выработку аденозина – вещества, замедляющего реакции нервной системы. Это влияет на мозговую активность, память, внимание и настроение.

Кроме того, на здоровье мозга положительно влияет чай с мелиссой, чай на основе женьшеня и чай с розмарином. Их периодически нужно добавлять в свой рацион, чтобы улучшить когнитивные способности и самочувствие в целом.

Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 326-68-71
Рэкламны аддзел (017) 363-66-04
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info
Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.
Заснавальнік, выдавец і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).